Прынящце новай Канстытуцыі СССР, канстытуцыі развітога сацыялізму, канстытуцыі будуемага камунізму, будзе не толькі гістарычнай падзеяй для нашай краіны, але і падзеяй велізарнага міжнароднага значэння.

*(З прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі тав. Л. І. Брэжнева на Пленуме ЦК КПСС 24 мая 1977 года).*


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 23 ЧЭРВЕНЯ 1977 г.

№ 23 (1173)

Цана 2 кап.


## ПА БДУ — ІНФАРМАЦЫЯ

Закончыліся ўступныя экзамены на завочны факультэт нашага універсітэта. Ад абітурыентаў паступіла 1.235 заяў, што ў два з лішнім раза перавышае план прыёму.

Паступаючыя добра здалі экзамены на спецыяльнасці біялогія, руская мова і літаратура, гісторыя, беларуская і руская мова і літаратура. Большая частка паступаючых на факультэт правазнаўства здала экзамены толькі на «добра» і «выдатна».

Хутка ў рады студэнтаў БДУ ўвальюцца новыя сілы: выдатнікі сярэдняй школы, спецыялісты з практычным стажам, былыя воіны Савецкай Арміі.



НА ЗДЫМКУ: капітан У. Пракоф'еў — абітурыент філасофскага аддзялення завочнага факультэта.

Фота М. ДУБОВІКА.

* * *

У нас у гасцях дэлегацыя з брацкай Польшчы. Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў азнаёміліся з вучэбным працэсам універсітэта, пабывалі на розных кафедрах і факультэтах. Госці з інтарэсам агледзелі музей БДУ, фотавыстаўку.

У Доме мастацтваў адбыўся вечар дружбы паміж польскім і савецкім народамі. На вечары быў дадзен канцэрт удзельнікамі мастацкай самадзейнасці БДУ, з поспехам выступіла агітбрыгада ідэалагічнага атрада нашага універсітэта. Віктарыну аб ПНР правялі члены дэлегацыі.

Р. НОВІК,
нам. сакратара камітэта камсамола па інтэррабоце.

* * *

Апошнія экзамены летняй сесіі здаюць студэнты нашага універсітэта. І многія з іх лічаць, што лепшы адпачынак ад разумовай працы — у студэнцкім будаўнічым атрадзе.

У гэтым годзе на факультэтах універсітэта створана 66 атрадаў. Геаграфія летніх маршрутаў байцоў у форменных куртках самая разнастайная. Студэнты будуць працаваць у Карэліі і Пскоўскай вобласці, на будаўнічых пляцоўках Мінскай вобласці і ў Малдавіі. Прадстаіць асвоіць больш як 1,5 млн. руб. капіталаўкладанняў.

А. КАЛІНКА,
начальнік штаба працоўных спраў універсітэта.

## ГАРАЧАЕ АДАБРЭННЕ

З вялікім інтарэсам і ўздымам сустрэў калектыў БДУ імя У. І. Леніна праект новай Канстытуцыі СССР і прамову Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі тав. Л. І. Брэжнева на Пленуме ЦК КПСС 24 мая 1977 года.

Уражваюць глыбіня, размах, маштабы і перспектывы Асноўнага Закона нашага жыцця. У першую чаргу ў праекце новай Канстытуцыі замацавана права кожнага чалавека на працу. Гэта значыць і на выбар прафесіі, на працу ў адпаведнасці з прызваннем. Асабліва важна тое, што размова ідзе аб працоўнай дзейнасці савецкіх людзей з улікам грамадскіх патрэб.

Л. І. Брэжнеў у прамове на майскім (1977 г.) Пленуме ЦК КПСС асабліва падкрэсліў: «Трэба, каб кожны савецкі чалавек усведамляў, што галоўная гарантыя яго правоў у канчатковым выніку — гэта магутнасць і працвітанне Радзімы. А для гэтага кожны грамадзянін павінен адчуваць сваю адказнасць перад грамадствам, добрасумленна выконваць свой абавязак перад дзяржавай, перад народам».

Наша краіна ўпершыню ў сусветнай гісторыі паставіла сваёй галоўнай задачай усебаковае развіццё асобы, стварыла ўсе неабходныя ўмовы для такога развіцця. У святле гэтага перад калектывам універсітэта стаяць вялікія задачы: не толькі навучаць, але і выхоўваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, валодаючых усімі неабходнымі рысамі будаўніка камуністычнага грамадства.

Цяпер, пасля азнаямлення з праектам новай Канстытуцыі СССР, шматтысячны калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна поўны імкнення працаваць яшчэ лепш, усе сілы аддаць росквіту любімай Айчыны. Як і ўсе савецкія людзі, супрацоўнікі і студэнты БДУ горача і аднадушна падтрымліваюць і адабраюць праект новай Канстытуцыі СССР — велічны дакумент, які акрэслівае перспектывы нашага камуністычнага заўтра.

## НАВУКОВАЙ РАБОЦЕ СТУДЭНТАЎ — АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ

У сваёй прамове на Усесаюзным злёце студэнтаў Л. І. Брэжнеў адзначыў, што працэс навучання ў ВНУ ўсё больш абапіраецца на самастойную, блізкую да даследчай работу студэнтаў.

Студэнцкая навуковая творчасць з кожным днём набывае ўсё большае значэнне, і найважнейшай задачай ВНУ з'яўляецца дасканаленне яе арганізацыі, распаўсюджванне набытага вопыту.

Яркім прыкладам шырокага прыцягнення студэнтаў да навуковай работы з'яўляецца кафедра паўправаднікоў фізічнага факультэта. У лабараторыях кафедры будучыя фізікі робяць свае першыя крокі ў свеце навуковых даследаванняў. Тут яны знаёмяцца з метадамі даследаванняў паўправаднікоў, сучаснай тэхнікай фізічнага эксперыменту.

Нішто не можа лепш навучыць студэнтаў творчаму падыходу да працы, чым удзел у сапраўдным навуковым даследаванні. А даследаванні паўправаднікоў з выкарыстаннем электроннага парамагнітнага рэзанансу, фоталюмінесцэнцыі, катодалюмінесцэнцыі, ЗВЧ і іншых метадаў, правядзенне эксперыментаў пры нізкіх і звышнізкіх тэмпературах у моцных электрычных і магнітных палях патрабуюць пэўнай творчай сталасці, культуры зносін з прыладамі і апаратурай, часта унікальнай і дарагакаштуючай.

Разам з тым, знаёмячыся з рэальнымі абставінамі навуковага пошуку, будучыя фізікі пачынаюць разумець, што любому пошуку, любому навуковаму дасягненню ў галіне фізікі паўправаднікоў папярэднічае карпатлівая штодзённая работа. Удзел у навуковых даследаваннях актывізуе мысліцельную дзейнасць студэнтаў, абуджае ў іх імкненне расшыраць свае веды, навыкі, выхоўвае ў іх любоў да сваёй спецыяльнасці.

Тэматыка студэнцкіх даследаванняў, як правіла, звязана з навукова-даследчай тэматыкай кафедры: звычайна гэта частка дзяржбюджэтнай ці гасдагаворнай работы. Увесь калектыў кафедры, які складаецца з вопытных і пачынаючых спецыялістаў, працуе над вырашэннем пэўных навуковых праблем. А кожны студэнт займае ў гэтым калектыве месца ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі і ідзе наперад у залежнасці ад сваіх здольнасцей і долі ўкладваемай працы.

Выкладчыкі кафедры выступаюць не толькі ў якасці навуковых кансультантаў. У працэсе індывідуальнай работы асаблівае значэнне набывае асабісты ўплыў кіраўніка на выхаванне ў студэнтаў творчых адносін да працы, высокай культуры, шырокай эрудыцыі. Такая пастаноўка работы выхоўвае ў студэнтаў патрэбныя якасці будучых спецыялістаў.

На працягу многіх год кафедра цесна звязана з вытворча-тэхнічным аб'яднаннем «Інтэграл». Частка студэнтаў займаецца навуковымі даследаваннямі непасрэдна на гэтым прадпрыемстве, што дазваляе ім яшчэ ў працэсе навучання дэталёва азнаёміцца з сучаснымі метадамі праектавання і асноўнымі тэхналагічнымі працэсамі вытворчасці паўправадніковых прылад і абсталявання. Як паказвае вопыт, гэтыя студэнты аказваюцца выдатна падрыхтаванымі да практычнай дзейнасці на вытворчасці і пасля заканчэння універсітэта з першых дзён самастойнай работы на прадпрыемстве могуць працаваць з поўнай аддачай. Вельмі добра адзываюцца на ВТА «Інтэграл» аб рабоце маладых спецыялістаў А. Амеліна, А. Вайніловіча, В. Тузлукова.

Штотыднёва па пятніцах на кафедры праводзіцца агульнауніверсітэцкі семінар па праблеме «Фізіка паўправаднікоў; радыяцыйная фізіка цвёрдага цела», дзе абмяркоўваюцца апошнія дасягненні і найбольш актуальныя праблемы фізікі паўправаднікоў. Шырокі ўдзел прымаюць у гэтым семінары і студэнты. Тут як бы сціраецца грань паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Кожны прысутнічаючы на семінары можа выказаць свой пункт гледжання, прыняць удзел у дыскусіі. Удзел у семінарах расшырае навуковы кругагляд студэнтаў, садзейнічае фарміраванню ў іх навуковага светапогляду, выпрацоўвае ўменне абагульняць, аналізаваць, выступаць з паведамленнямі, дакладамі.

Лепшыя навуковыя работы студэнтаў кафедры штогод прадстаўляюцца на універсітэцкую студэнцкую канферэнцыю і рэспубліканскі агляд студэнцкіх работ. У гэтым годзе на рэспубліканскі агляд студэнтамі кафедры было прадстаўлена 25 работ, 7 з іх былі прызнаны работамі першай катэгорыі. Рашэннем аргкамітэта конкурсу работа студэнта В. Красоўскага «Уплыў флуктуацыі прымясцовага патэнцыялу на эфект Буштэйна-Моса ў моцна легіраваным арсенідзе галію» была асоба адзначана і ўдастоена прэміі. Акрамя таго, работы Хо Ф'юк Хоай і В. Красоўскага рэкамендаваны на Усесаюзны конкурс студэнцкіх навуковых работ.

У красавіку гэтага года ў БДУ адбылася 24-я студэнцкая канферэнцыя, дзе студэнтамі кафедры былі прачытаны 42 даклады. Студэнты А. Цыкуноў і Хо Ф'юк Хоай прынялі ўдзел у навуковай студэнцкай канферэнцыі рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі і Малдавіі. Іх даклады былі адзначаны журы як адны з лепшых на секцыі фізікі, а матэрыялы дакладаў апублікаваны. Студэнты Гусеў, Жураўкевіч, Аджаеў і Прасановіч вельмі паспяхова прадставілі Беларусію на рэспубліканскай студэнцкай канферэнцыі ў г. Адэсе.

З кожным годам пашыраецца ўдзел студэнтаў кафедры ў навуковых даследаваннях, паглыбляецца змест даследаванняў. Аднак у гэтай важнай справе вычарпаны, відаць, далёка не ўсе магчымасці. Навуковая работа студэнтаў заслугоўвае самай сур'ёзнай увагі і падтрымкі, бо іменна ў ВНУ закладваюцца будучыя поспехі вялікай навукі і вытворчасці.

Т. КОЛЬЧАНКА,
асістэнт кафедры фізікі паўправаднікоў.

# НАШ СТАРЭЙШЫ СЯБАР



Пахне свежасцю мокрага лесу. Мае сябры, слухачы групы журналістаў падрыхтоўчага аддзялення, цесным колам сядзяць ля кастра. Над Нёманам мякка разліваецца ціхая, зладжаная песня. Спяваем з душой, цалкам аддаючыся пад уладу добрага настрою, весела пaглядаючы і прыслухоўваючыся да нашага куратара — Галіны Паўлаўны Раманчыкавай. З прыемнасцю думаецца, што Галіна Паўлаўна ўвайшла ў жыццё кожнага рабфакаўца назаўсёды.

На падрыхтоўчае аддзяленне прыйшлі ўсе розныя, розныя па сваіх характарах, густах, прыйшлі з агульнай мэтай — навучыцца нялёгкай журналісцкай справе. Змяніліся і ранейшыя ўяўленні аб студэнцкім жыцці. Давялося таксама спаткацца і з першымі цяжкасцямі. Галіна Паўлаўна навучыла больш крытычна ставіцца да саміх сябе, правільна разумець адказнасць, якая кладзецца на таго, каму давядзецца называць сябе студэнтам. Будучы тонкім псіхолагам, наш куратар умее знайсці патрэбную параду для кожнага з нас, тую агульную нябачную нітачку, якая згуртоўвае калектыў у адзінае цэлае. Галіна Паўлаўна — чалавек добрай душы. У яе вялікая зацікаўленасць у лёсе людзей.

Неяк, збіраючыся на прэм'еру універсітэцкага драматычнага тэатра, Галіна Паўлаўна прызналася:

— Пайду, пагляджу спектакль. Там будзе іграць мая былая вучаніца.

Часта да нас забягаюць, хоць на хвіліну, студэнты I курса, былыя слухачы падрыхтоўчага аддзялення. Забягаюць, каб расказаць пра свае штодзённыя студэнцкія клопаты і справы, каб падзяліцца з Галінай Паўлаўнай сваімі ўражаннямі, каб атрымаць шчырую параду.

Гаворыць за сябе і такая маленькая, простая, на першы погляд, дэталь. Галіна Паўлаўна заўсёды называе нас па імёнах. Неяк у размове Сярожа Сінілаў зазначыў:

— Наша Галіна Паўлаўна валодае вялікім патэнцыялам ведаў і мудрага жыццёвага вопыту. Яна ўмее цаніць у людзях іменна іх здольнасць быць самімі сабой.

І сапраўды, як важна для моладзі, калі цябе па-сапраўднаму разумеюць, бачаць у цябе як станоўчыя рысы, так і адмоўныя і шчыра стараюцца дапамагчы. Гэта вельмі важна для станаўлення чалавечых характараў. Мімалётная падказка, як сябе паводзіць у тых ці іншых абставінах, для многіх ператвараецца ў правіла.

Хаця мы ўжо і дарослыя, але ўсё ж не заўсёды поўнасцю ўсведамляем цяжар педагагічнай працы. Нашы веды не заўсёды адпавядаюць сучаснаму ўзроўню патрабаванняў. У групе ёсць і такія слухачы, якія зусім не вывучалі беларускую мову і літаратуру. А без ведання гэтага будучаму журналісту нельга. Галіна Паўлаўна Раманчыкава стараецца як мага лепш і змястоўней данесці да нас крыніцы пазнання мовы і літаратуры, іх багаты каларыт і самабытнасць. А яшчэ яна па-сапраўднаму ўмее цаніць гумар. Нам заўсёды з ёй добра і проста.

А. ЯКУБОЎСКАЯ.

**НА ЗДЫМКУ: Г. П. Раманчыкава.**

**Фота В. ПАТАПЕНКІ.**

# ПРАЦЯГ ПЕСНІ

Да гэтага дня мы ішлі пяць год...

Знаёмы будынак кансерваторыі ў гэты дзень, здавалася, дрыжэў ад музыкі. Прахожыя з цікавасцю ўзнімалі галовы да раскрытых вокнаў, шчодра рассыпаючых гукі скрыпкі, фартэпіяна, кантрабаса. Але вось, заглушаючы іх, дружна і з запалам грымнуў хор.

— Здорава пяюць! — з раўнівай ноткай заўважыў нехта з нашых.

— Нічога, спяём і мы, — падбадзёрваючы, адгукнуўся другі.

Драўляныя дзверы важна прапусцілі нас. Дом музыкі... Сюды прыходзяць тыя, хто разумее, любіць і цэніць музыку, і тыя, хто хоча навучыцца гэтаму.

Ад строгіх рабят, ад прыгожа ўбраных дзяўчат у вестыбюлі раптам павеяла нечым святочным, урачыстым...

Сапраўды, у кансерваторыі — свята, калі толькі можна так назваць дзень, у які падводзяцца вынікі напружанай, упартай, карпатлівай працы — дзень абароны дыпломаў выпускнікамі аддзялення харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Сваіх кіраўнікоў «абараняюць» самадзейныя калектывы. «Абаранялі» і мы свайго кіраўніка — Васіля Яловіка.

Мы — гэта студэнты журфака, аматары харавых спеваў. І абараняць свайго кіраўніка былі настроены самааддана і горача. Але як там атрымаецца?!

А вось і Вася: у чорным касцюме, з усмешкай, а ў вачах — трывога і надзея:

— Ну, як настрой, рабяткі? Усе тут? Тады наперад!

Мы ішлі доўгімі калідорамі. Час ад часу іх гулкую цішыню парушалі то пяшчотныя напевы скрыпкі, то магутны бас кантрабаса. А вось урачыста абвясціла аб сабе фартэпіяна. Сюды мы і накіраваліся.

— Увага! Пачынаем распявацца! — Васін голас гучаў дзелавіта, сур'ёзна. Акорд, другі...

Потым, спяшаючыся, мы амаль беглі па тых жа калідорах у канцэртную залу, таму што паступіла каманда: «На сцэну!»

— Выступае харавая капэла Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Кіраўнік — студэнт V курса аддзялення харавога дырыжыравання Васіль Яловік, — гучна, аб'явіла Таццяна Леанкова.

Разам уздыхнуў хор, беручы дыханне... Хвалюючыя, трывожныя словы песні падалі ў залу, песня шырылася, нарастала. І раптам...

У гэты момант я чамусьці ўспомніла выступленне на сусветным чэмпіянаце Ірыны Радніной і Аляксандра Зайцава, калі раптам змоўкла музыка. Гэта была страшная ў сваёй нечаканасці хвіліна. Але ні на секунду не разгубіліся нашы фігурысты. І як узнагарода за мужнасць — зноў ганаровае першае месца!

У імгненне праляцела гэта ўсё ў галаве, калі саліст кансерваторыі збіўся з рытму, а потым і зусім змоўк.

Тады Вася запеў сам.

Адразу ўспацеўшы яго твар стаў напружаным. Але ні ценю разгубленасці. А вочы — запрашалі, малілі, патрабавалі... Песню мы ўсё ж такі дапелі да канца.

І вось ужо Вася, падбадзёрваючы, усміхнуўся нам, узмахнуў рукой!

«Ах ты, стэп шырокі», — пелася так шырока, так прывольна і так... сумна. Але наша жаданне перамагчы не знікла ад няўдачы. Наадварот, мы спявалі так, як, здавалася, ніколі яшчэ не спявалі.

Закончылася наша выступленне. І тут зала ўзарвалася апладысментамі. Усхваляваныя, з палаючымі шчокамі выскачылі мы ў калідор, адчуваючы сэрцам: «Парадак!»

Хутка стала вядома думка журы: работу В. Яловіка ацанілі як адну з лепшых...

Мы ішлі да гэтага дня пяць год. Увёў нас у свет музыкі, адкрыў перад намі шчодрую, глыбокую мудрасць музыкі, радасць і раздолле народнай песні, прыцягнуў да вялікага мастацтва наш малады кіраўнік. Развітваючыся, мы ўсе гаварылі яму: «Вялікае, сардэчнае дзякуй за песню, Вася!»

Васілю Яловіку ісці шляхам мастацтва ўсё жыццё — на радасць і шчасце людзям. І няхай заўсёды гучаць у яго адрас словы: «Дзякуй за песню!».

**Т. ВОЛКОВА.**

## Нашы выпускнікі

# Я Е ПРЫЗВАННЕ

Яшчэ са школьнай лаўкі марыла Аня Люндрэс стаць філолагам, прысвяціць сябе літаратуры. І чуць не хацела пра іншую спецыяльнасць. Літаратуру ведала, любіла, была ўпэўнена ў паспяховай здачы ўступных экзаменаў ва універсітэт. Праўда, некалькі пабойвалася гісторыі (іменна па гэтаму прадмету атрымала «чатыры»). 19 балаў, яна праходзіць, ззаду хваляванні і трывогі, наперадзе вучоба, новыя сябры, новыя веды.

Пяць гадоў прайшлі вельмі хутка. Вучыцца было цікава, лёгка. Прадмет добра разумела, ведала, да сесій рыхтавалася вельмі сур'ёзна і ў выніку заўсёды здавала на «выдатна».

Пасля заканчэння універсітэта Ганна Ільінічна магла стаць бібліятэкарам, малодшым навуковым супрацоўнікам, але выбрала самую цяжкую і самую ганаровую з усіх прафесій — прафесію настаўніка. Ужо даўно марыла яна працаваць з дзецьмі, сябраваць з імі. Больш за ўсё цаніла і любіла ў іх тэмперамент, пастаянную прагу да ведаў, непасрэднасць у паводзінах.

Пачынала яна ў Заводскім раёне, у 68-й школе. Навучала рабят чацвёртых і дзявятых класаў. Працаваць было складана — вельмі ж вялікі быў кантраст паміж маленькімі і вялікімі. Да адных адзін падыход, адна методыка, да другіх — усё іншае. Але з рабятамі пасябравала, знайшла агульную мову. Лепшаму ўзаемаразуменню садзейнічалі частыя сумесныя культпаходы ў кіно, на выстаўкі, займальныя дыспуты аб прачытаных кнігах, прагледжаных кінафільмах. Для малых яна была самай кампетэнтнай крыніцай ведаў. «Так нам настаўнік сказаў», — вышэйшая ступень упэўненасці ў чымсьці. З чацвёртымі класамі было лёгка, а вось з больш старэйшымі рабятамі — цяжэй і складаней. Былі рабяты, якія не разумелі яе, былі і такія, якіх не разумела яна, але ўсё ж знаходзіла падыход да ўсіх. Ёй прыходзілася ім шмат даказваць, у многім пераконваць. З імі ёй было, канешне, цяжка, але ў той жа час і намнога цікавей. Шэсць гадоў работы ў гэтай школе давалі права зрабіць некаторыя вывады, падвесці вынікі, зазірнуць у будучыню.

Наступны этап яе працоўнага жыцця — 21-я школа. Родная і блізкая 21-я. Тут яна вучылася, тут марыла вучыць дзяцей, і вось мары збыліся. Папаліся старшакласнікі — 9-ы і 10-ы класы. Рабяты ёй адразу спадабаліся. Класы ў цэлым добра паспявалі па літаратуры. І гэта ў многім дапамагала ёй у рабоце. Настаўніца таксама спадабалася і сваімі паводзінамі, і тым, як яна падыходзіла да разбору мастацкіх твораў: заўсёды вялікае значэнне надавала дэталям, якія найчасцей не заўважалі вучні. Ніколі не абыходзіла яна спрэчныя, дыскусійныя пытанні, і гэта таксама прыцягвала да яе рабят.

Сачыненне — гэта заўсёды вынік сумеснай працы, гэта адзнака не толькі работы вучня, але і настаўніка. Таму да сачыненняў Ганна Ільінічна рыхтуе вучняў загадзя, прапрацоўвае тэмы, паказвае, што лепш выкарыстаць у сачыненні. Пасля кожнай пісьмовай работы робіцца падрабязны разбор усіх работ. Асобныя знакі, якія яна ставіць на палях сшыткаў, указваюць вучню на больш канкрэтныя памылкі ў рабоце. Гэта неацэнная дапамога вучню. Часта на ўроках літаратуры праз мастацкія вобразы ўзнімаюцца пытанні сённяшняга жыцця, нормаў паводзін, маралі. Тады ўрокі ператвараюцца ў своеасаблівыя ўрокі этыкі, маралі. Вось такая методыка работы прыйшлася па душы рабятам. Яны моцна пасябравалі, ім разам лёгка і зразумела. Усё гэта гаворыць аб тым, што настаўнік яна — ведаючы і ўмеючы. Галоўная рыса Ганны Ільінічны — жыць інтарэсамі, праблемамі, клопатамі сваіх вучняў. Ім яна аддае ўсе свае веды, усё сваё жыццё.

**А. МІРОШНІКАЎ,**
**вучань 9-га «Б» класа 21-й сярэдняй школы.**

## На кафедрах і ў лабараторыях





**Фота А. БАСАВА.**

## Група «Доўг» працягвае пошук

# БЫЦЬ ЧАЛАВЕКАМ

Жывуць сярод нас людзі з цікавай біяграфіяй і лёсам. Знаёмячыся з імі, падтрымліваючы сувязі, міжволі стараешся раўняцца на іх у сваім яшчэ не вельмі багатым падзеямі жыцці...

З адным з такіх людзей нас пазнаёміла пошукавая работа ў групе «Доўг». Гэта журналіст, заслужаны дзеяч культуры БССР Давід Саламонавіч Пінхасік.

Жыццё не выбірала для яго лёгкіх шляхоў. Рана памёр бацька. На плечы падлетка лягла ўся цяжкасць клопатаў аб сям'і. Займаўся ў школе і працаваў у электрамайстэрні. З першай зарплаты купіў 200 г каўбасы — гэта быў самы каштоўны падарунак для сям'і.

У журналістыку Давід Пінхасік прыйшоў рана: у 14 гадоў апублікаваў сваю першую заметку. А ў 17 год Пінхасік па закліку ЦК ЛКСМБ, як і многія іншыя камсамольцы, паехаў на веснавую сяўбу. Тут ён напісаў (не маючы патрэбных навыкаў) нарыс «Трактарыст Крот». «Чырвоная змена» надрукавала матэрыял і запрасіла пачынаючага карэспандэнта супрацоўнічаць.

«Першыя творчыя поспехі зусім не ўскружылі галаву, — успамінае журналіст. — Працавалі да знясілення і, магчыма, таму рана сталелі...»

Праца ў газеце захапіла хлопца. Ён шмат пісаў, здзіўляючы сяброў працаздольнасцю і аператыўнасцю. У 1935 годзе ў Маскве праходзіў першы ў краіне парад фізкультурнікаў. Вылецеўшы туды ў камандзіроўку, Д. С. Пінхасік з вялікай цяжкасцю дастаў пропуск на парад.

Дзень прайшоў у напружанай працы, а раніцай матэрыял ужо ляжаў на стале рэдактара ў Мінску. Наступным днём «Чырвоная змена», адзіная з беларускіх газет, апублікавала рэпартаж аб гэтым парадзе.

А калі ў 1939 годзе пачалося вызваленне Заходняй Беларусі, Давід Саламонавіч у Вільнюсе стаў відавочцай мітынгу за далучэнне да Савецкай Беларусі. Звязацца з Мінскам у тыя трывожныя дні было амаль немагчыма. З 200 прысутнічаючых карэспандэнтаў рэпартаж аб мітынгу перадалі толькі двое: Д. С. Пінхасік (тады ён ужо працаваў у «Советской Белоруссии») і Палякоў з «Красной звезды».

Майстэрства журналіста не прыходзіць само. За поспехамі Давіда Саламонавіча ў публіцыстыцы стаіць бесперапынная карпатлівая праца. Аб яго творчасці немагчыма паведаміць усё, таму што практычна немагчыма прасачыць дзесяткі, сотні яго камандзіровак, сустрэч з цікавымі людзьмі.

Д. С. Пінхасік зараз працуе ў аддзеле Саветы і прафсаюзы «Советской Белоруссии» і часта атрымлівае пісьмы з просьбай аб дапамозе. Вышэйшы абавязак журналіста ён бачыць у тым, каб дапамагаць людзям.

— Памятай, — гаворыць ён мне,—быць журналістам — гэта значыць быць Чалавекам.

Быць Чалавекам...

Заставацца Чалавекам, барацьбітом у час нягод і выпрабаванняў...

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны Д. С. Пінхасік разам з Міхасём Лыньковым, Кандратам Крапівой, Ільёй Гурскім працуе ў франтавой газеце «За Савецкую Беларусь». Матэрыялы для газеты журналісты прыносілі прама з перадавой, з салдацкіх акопаў. Пазней рэдакцыю накіравалі на Цэнтральны фронт.

Па дарозе ў Гомелі ўдалося папоўніць друкарню шрыфтамі і захапіць некалькі рулонаў паперы. Гэта зараз проста гучыць: «папоўніць», а тады такая аперацыя магла каштаваць жыцця.

Нашы войскі ўжо былі на супрацьлеглым беразе Сожа. Д. Пінхасік з шафёрам Сашам Кічанам памчаўся па засыпаных бітымі цаглінамі і шклом вуліцах скрозь строй палаючых дамоў да друкарні. Дырэктар «Палесдруку» выдаў ім шрыфты і некалькі рулонаў паперы. Назад перапраўляліся праз наведзены сапёрамі шаткі пантонны мост. Пад гружанай палутаркай ён прагінаўся, вада падступала да кабіны. Толькі вопытнасць шафёра дазволіла перабрацца да сваіх. Таварышы сустрэлі радасна. Разглядалі бліскучыя, яшчэ не кранутыя фарбай шрыфты і пахлопвалі па крутых баках звінячыя рулоны.

...Мы сядзім у кабінеце Давіда Саламонавіча. Сёння ён дзяжурыць па нумару. Чытае паласу. Я таксама старанна чытаю, стараючыся знайсці памылкі. Але газетная старонка канчаецца, памылак няма. А ручка Давіда Саламонавіча бегае па паперы, крэсліць, перастаўляе словы, абзацы. Я засаромлена падаю яму чыстую паласу.

— Нічога, — усміхаецца ён, —вопыт прыйдзе. Галоўнае, любіць сваю справу.

**Л. ПРОХАРАВА,**
**член групы «Доўг».**

# ІНВЕНТАРЫ ПУБЛІКУЮЦЦА ЎПЕРШЫНЮ

У выдавецтве «Навука і тэхніка» ў 1977 годзе выйшаў з друку зборнік дакументаў «Інвентары магнацкіх уладанняў Беларусі XVII—XVIII ст. Уладанне Смаргонь».

Інвентары прадстаўляюць сабой гаспадарчыя вопісы феадальных уладанняў. Яны складаліся ў Беларусі, Літве, Прыбалтыцы, Польшчы і прызначаліся для вызначэння становішча феадальна залежнага насельніцтва і рэгулявання адносін паміж уласнікам і часовым уладальнікам ці кіраўніком маёнтка.

Магнацкія латыфундыі ў XVII—XVIII ст. мелі значную ўдзельную вагу ў структуры землеўладання на тэрыторыі Беларусі, таму матэрыялы гэтага віду ўладанняў прадстаўляюць істотнае значэнне для агульных вывадаў па аграрнай гісторыі. Для гэтай публікацыі адбіраліся інвентары, складзеныя ў розныя гады па ўладанню Смаргонь (цяпер гэта буйны раённы цэнтр), выяўленыя ў цэнтральных дзяржаўных гістарычных архівах Беларускай і Літоўскай ССР, і публікуюцца яны ўпершыню.

Буйное феадальнае землеўладанне Смаргонь у пачатку XVII ст. належала брэсцкаму ваяводзе Хрыстафору Зяновічу, а з 1628 года перайшло ў прыватнасць да Радзівілаў—самых буйных магнатаў Беларусі.

У працэсе шматгадовай працы па выяўленню матэрыялаў складальнікамі інвентароў магнацкіх уладанняў Беларусі доктарам гістарычных навук П. Г. Казлоўскім, кандыдатам гістарычных навук Е. П. Шлосбергам, начальнікам аддзела выкарыстання і публікацыі ЦДГА БССР Е. Л. Бравер і рэдакцыйнай калегіяй у саставе дактароў гістарычных навук Е. М. Карпачова, П. Г. Казлоўскага, З. Ю. Капыскага і кандыдата гістарычных навук А. І. Азарава прароблена вельмі важная і карпатлівая праца: супастаўлена дзевяць апісанняў аднаго і таго ж буйнога памесця за розныя гады. Дакументы даставерныя, асабліва ў адносінах фактычнага стану памесця і нормаў павіннасцей насельніцтва.

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы зборніка да выдання прымалі старшы навуковы супрацоўнік Цэнтральнага гістарычнага архіва БССР Н. К. Булыга, супрацоўнікі І. В. Рошчын, Н. К. Лешчанка.

Дакументы па Смаргоні дапамогуць чытачам пазнаёміцца з багаццем і разнастайнасцю інфармацыі аб феадальнай і сялянскай гаспадарцы, раскрыць заканамернасці, уласцівыя феадальным уладанням XVII—XVIII ст., разгледзець у двухвекавым развіцці характэрныя рысы быту беларускай вёскі, становішча сялян.

Важнае значэнне маюць матэрыялы інвентароў аб структуры феадальнай вотчыннай гаспадаркі, а таксама даныя, якія дазваляюць прасачыць змены ва ўзроўні вытворчых сіл сельскай гаспадаркі і промыслаў панскага памесця, даходаў магнатаў, сведчанні аб размеры і характары ўсемагчымых пабораў з сялян.

Тэкст інвентароў адлюстроўвае двухвекавое ўзаемадзеянне беларускай і польскай пісьменнасці. Каштоўны матэрыял па анамастыцы змяшчаецца ў спісах прозвішчаў сельскіх і гарадскіх жыхароў. Геаграфічныя назвы ў інвентарах змяшчаюць паведамленні па тапаніміцы.

Аднак гэтым не вычэрпваецца значэнне інвентароў як крыніц. Яны змяшчаюць нямала каштоўных паведамленняў для этнографаў і мастацтвазнаўцаў аб архітэктуры феадальных жылых дамоў, іх унутраным убранстве, аб гаспадарчых збудаваннях, абсталяванні прамысловых устаноў, прадуктах харчавання.

Частка даных асвятляе гарадское жыццё Смаргоні ў XVII — XVIII ст. Тут маюцца сведчанні аб гарадской забудове, аб занятках рамяством, гандлем, земляробствам, аб гарадскім рынку, гандлёвых радах, даецца перапіс вуліц, жывёлы, азёр і прудоў, хатняга посуду, даны апісанні садоў і гародаў.

Апублікаваны зборнік разлічан таксама на спецыялістаў па гісторыі, архітэктуры, філасофіі, краязнаўцаў, архіўных і музейных работнікаў, дэмографаў, даследчыкаў беларускай мовы і культуры, выкладчыкаў ВНУ і сярэдніх школ, а таксама студэнтаў гістарычнага, эканамічнага і філалагічнага факультэтаў.

Нямала карыснага і цікавага змогуць пачарпнуць з гэтай кнігі пісьменнікі, мастакі, архітэктары.

Мы спадзяёмся, што вучоныя-гісторыкі нашай рэспублікі выкажуць свае думкі аб зборніку, які выдадзен пад грыфам Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры СМ БССР, Інстытута гісторыі АН БССР і ЦДГА БССР.

Нам важны іх водгук таму, што ў будучым архівістам рэспублікі і супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР прадстаіць работа над зборнікамі іншых магнацкіх уладанняў

Зборнік выдадзен на рускай мове. Аб'ём 20 арк. Цана 1 руб. 88 кап. Заказы можна дасылаць па адрасу: 220038, Мінск, вул. Казлова, 26, Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР.

**С. М. ЛОРЫНА.**



## Стоп-кадр: у час сесіі.



## Новыя кнігі

### СПІС ЛІТАРАТУРЫ, ЯКАЯ ПАСТУПІЛА У КАБІНЕТ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК.

1. **ТУГАРЫНАЎ В. П. і РУМЯНЦАВА Т. М.** Прадбачанне і сучаснасць. Л., Ленвыдавецтва, 1976.
2. **УДОВІН А. І., ДРОБІЖАЎ В. З.** Рост рабочага класа СССР. 1917 — 1940 гг. М., «Мысль», 1976.
3. **ФІН В. К.** Лагічныя праблемы інфармацыйнага пошуку. М., «Наука», 1976.
4. **ЕРАФЕЕЎ Н. А.** Што такое гісторыя. М., «Наука», 1976.
5. **РЭКУЦ І. Ф.** Філасофскія праблемы крытыкі рэлігіі ў атэістычнай спадчыне А. В. Луначарскага. Мн., выд-ва БДУ імя У. І. Леніна, 1976.
6. **КУЗЬМІН В. Ф.** Аб'ектыўнае і суб'ектыўнае. (Аналіз працэсу пазнання). М., «Наука», 1976.
7. **МАРАШ Я. Н.** Студэнцкі навукова-даследчы гурток. Мн., «Вышэйшая школа», 1976.
8. **САШЫН Г. З.** Балівія. Нарыс навейшай гісторыі. М., «Мысль», 1976.
9. **КОРАСТАЎЦАЎ М. А.** Рэлігія старажытнага Егіпта. М., «Наука», 1976.
10. **МІКАЛАЕВА Т. В.** Прыкладное мастацтва Маскоўскай Русі. М., «Наука», 1976.
11. **ВАЛГІН В. П.** Нарысы гісторыі сацыялістычных ідэй. Першая палова XIX ст. М., «Наука», 1976.
12. **БУГАНАЎ В. І.** Сялянскія войны ў Расіі XVII—XVIII ст. М., «Наука», 1976.
13. **КАРАБЛЁЎ І. Ш.** Ганібал. М., «Наука», 1976.
14. **ЛІХАЧОЎ Д. С.** «Слова аб палку Ігаравым». Гісторыка-літаратурны нарыс. М., «Просвещение», 1976.
15. **ГОЛЬДБЕРГ Д. І.** Нарыс гісторыі рабочага і сацыялістычнага руху ў Японіі (1868 —1908 гг.). М., «Наука», 1976.
16. Рабочая кніга сацыёлага. М., «Наука», 1976.
17. Міжнародная палітыка КПСС і знешнія функцыі Савецкай дзяржавы. Рэдкалегія: Д. А. Керымаў і інш. М., «Мысль», 1976.
18. **ПЛЫМЕЎСКІ Б.** Пяцігодка эфектыўнасці і якасці. М., Палітвыдавецтва, 1976.
19. **КАСТАКОЎ В.** Працоўныя рэсурсы пяцігодкі. М., Палітвыдавецтва, 1976.
20. Камсамол і пяцігодка. 1971 — 1975. М., «Молодая гвардия», 1976.
21. **КІРЫЧЭНКА В.** Асноўныя задачы і асаблівасці дзесятай пяцігодкі. М., Палітвыдавецтва, 1976.

**Н. СЛАВІНСКАЯ,**
старшы бібліятэкар.



Заканчваецца апошняя работа па падрыхтоўцы да адпраўкі на месцы дыслакацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Вызначаны аб'екты, на якіх давядзецца працаваць пасланцам нашага універсітэта. Ужо адляцелі на БАМ кварцір'еры атрада імя Ленінскага камсамола, збіраюцца ў дарогу і ўсе астатнія атрады.

Для рабят атрада «Верасы» хімічнага факультэта сёлетні працоўны семестр будзе трэцім у іх жыцці. Працаваць давядзецца на будаўніцтве школы непадалёку ад пасёлка Чупа Карэльскай АССР. Касцяк атрада складаюць трэцякурснікі, бадзёрыя, поўныя энергіі і энтузіязму юнакі і дзяўчаты. Рабяты нядрэнна папрацавалі ў час падрыхтоўчага перыяду і зараз чакаюць каманды «На старт!»

НА ЗДЫМКАХ: агітбрыгада атрада «Верасы» выступае на універсітэцкім аглядзе-конкурсе.

Тэкст і фота М. ЧАЛЕЯ.



# ЯК МЫ АДПАЧЫВАЕМ?

Пытанне аб правільным вырашэнні праблемы адпачынку студэнтаў у інтэрнатах хвалюе ўсіх: і саміх студэнтаў, і камсамольскія арганізацыі, і кіраўніцтва ВНУ. Адны знаходзяць выйсце — танцы, іншыя — у так званых вечарах адпачынку. Але вечары часта зводзяцца да тых жа танцаў. Зразумела, ніхто не супраць гэтага: каму ў студэнцкім узросце не хочацца патанцаваць! Але нярэдка можна пачуць:

— Сумна ў нас у інтэрнаце. Выпадае хвіліна вольнага часу, а як яе выкарыстаць з большай карысцю — не ведаеш. Ідзеш у кіно...

Добра, калі ідуць у кіно, а бывае і так, што хто-небудзь заверне ў «Гастраном».

Як пазбегнуць гэтых выпадкаў? І тут я хачу расказаць пра работу студсавета інтэрната № 3.

Інтэрнат — самы маленькі ва універсітэце. Жывуць у асноўным слухачы падрыхтоўчага аддзялення. З самага пачатку студсавет узняў пытанне аб адпачынку жыхароў. Пры дапамозе студэнтаў філасофскага аддзялення Уладзіміра Карагіна і Барыса Кандратава быў створан «Клуб сацыяльных праблем».

У ім — рознабаковая тэматыка лекцый, дыскусіі. Хто не хоча прыняць удзел, напрыклад, у дыскусіі «Чалавек у гэтым складаным сучасным свеце»? Хто адмовіцца ўбачыць сапраўдны лазер, паглядзець, як ствараюцца галаграмы? А хто не хоча паслухаць пра БАМ з вусна[ў] байца СБА, які працаваў на гэтай будоўлі?

Значыць, можна арганізаваць адпачынак, можна зрабіць яго цікавым і карысным. Можна, але для гэтага патрэбны намаганні студсавета, дапамога дэканата, энтузіязм студэнтаў. А энтузіязм ёсць, трэба толькі накіраваць яго ў патрэбнае рэчышча.

І. ГАЎРЫЦКІ.

Адышоў у гісторыю 1976-ы, алімпійскі год, год рэкордаў і перамог, залатымі літарамі ўпісаных у слаўны летапіс савецкага спорту.

Эстафету XXII летніх Алімпійскіх гульняў прыняла сталіца нашай Радзімы — Масква. Уся краіна рыхтуецца да правядзення гэтага вялікага спартыўнага свята.

Будуюцца і рэканструіруюцца дзесяткі спартыўных збудаванняў, на якіх спартсмены падаруюць нам новыя сусветныя рэкорды.

# Дадаткова 500 тысяч!

«Спортлато» — пастаянны і верны саюзнік спорту. Кожны ўдзельнік гэтай гульні ведае, што, акрамя асабістага матэрыяльнага выйгрышу, частка сродкаў ідзе на ўмацаванне і развіццё спартыўнай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Сотні розных спартыўных збудаванняў у нашай краіне ўзведзены і ўзводзяцца на сродкі ад спартыўна-лічбавай латарэі.

Такім чынам, удзел у «Спортлато» — залог далейшага росту масавасці спартыўнага руху.

«Спортлато» — гульня па правілах. Дакладнае і акуратнае запаўненне картак — абавязковая ўмова ўдзелу ў тыражы. Але ёсць і «парушальнікі» правілаў запаўнення картак. Яны забываюцца своечасова апусціць часткі «Б» і «В» у скрынкі «Спортлато». Такія карткі ўдзелу ў тыражы не прымаюць. Згодна з умовамі правядзення спартыўна-лічбавай латарэі, сродкі ад рэалізаваных, але аказаўшыхся па-за гульнёй картак, паступаюць у дадатковы выйгрышны фонд двух тыражоў кожнага года, які разыгрываецца два разы ў год.

29 чэрвеня 1977 года адбудзецца 26-ы асобы тыраж «Спортлато» і «Спортлато-2». Яго дадатковы збор складае 500 тысяч рублёў. Продаж картак «Спортлато» і «Спортлато-2» 26 асобага тыража будзе адбывацца ў кіёсках «Спортлато» і кіёсках «Саюздрук». Напамінаем тым, хто гуляе, што часткі «Б» і «В» трэба апускаць у скрынкі «Спортлато» не пазней 14.00 аўторка для г. Мінска.

Для гарадоў вобласці і рэспублікі апошні тэрмін вымання частак «Б» і «В» указан на скрынках «Спортлато». Выплата выйгрышаў па тыражах «Спортлато» і «Спортлато-2» пачынаецца на адзінаццаты дзень пасля правядзення тыражоў і праводзіцца на працягу аднаго месяца.

Паспяховага вам старту ў спартыўнай латарэі!

А. РАГАЛЬСКІ,
старшы інструктар
Белспортлато.

# СТАРАЖЫТНА — СУЧАСНЫ

У даведніку «Па Літве» адзначана: Вільнюс — горад, дзе старажытнасць здзіўляюча спалучаецца з сучаснасцю.

З гэтым згаджаешся, як толькі робіш першыя крокі ад чыгуначнага вакзала. Адразу неяк падазрона сустракаюць будынкі — помнікі ў стылях готыкі, барока і класіцызму.

Вуліца, якая зараз носіць імя М. Горкага, самая старажытная. Сваімі дамамі яна расказвае амаль аб усіх архітэктурных стылях Заходняй Еўропы.

Асабліва здзіўляешся таму, што некаторыя дамы пабудаваны на ёй у XVI стагоддзі, і ў іх зараз жывуць і працуюць людзі.

З кожнага кутка старога і новага горада бачна вялікая башня. Пабудавана яна заснавальнікам Вільнюса князем Гедымінам у XIV стагоддзі. Аб гэтым існуе легенда. Аднойчы князь Гедымін са сваім слугою вяртаўся з палявання. Ноч застала іх на гэтай самай гары. Князю прысніўся жалезны воўк. Гедымін хутка разбудзіў слугу, каб той растлумачыў яму такую цікавую з'яву. Слуга сказаў, што калі тут будзе пабудаван горад, ён стане непрыступнай крэпасцю. Так і адбылося. Горад быў пабудаван, і яго ніяк не маглі захапіць шведскія рыцары.





Зараз у башні створан музей гісторыі Вільнюса. Нам пашанцавала: якраз было мала наведвальнікаў, і мы змаглі трапіць у яго.

Значнае месца адводзіцца ў музеі экспанатам з часу гераічнай барацьбы літоўскага народа з крыжаносцамі. У кнізе водгукаў — запісы наведвальнікаў з Польшчы, Германіі, Венгрыі, Чэхаславакіі, з усіх савецкіх рэспублік.

Вільнюс не толькі горад мінулага. Гэта горад сучаснасці, цэнтр літоўскай навукі і мастацтва. Гаворачы аб гэтым, нельга не звярнуцца да некаторых лічбаў. Зараз у горадзе 40 навуковых устаноў, 9 музеяў, 7 тэатраў і канцэртных залаў, больш 15 кінатэатраў. Багатая рэспубліканская бібліятэка. За ракою Нерыс цэлыя масівы новабудоўляў, развітая прамысловасць.

Золатам блішчаць пад летнім сонцам купалы цэркваў і касцёлаў. У зелені патанае старажытны і малады Вільнюс. Падобна магніту, прыцягвае ён да сябе сваёй прыгажосцю турыстаў.

У. БЕЛЬСКІ,
У. ДЗЯТЧЫК.

Лісток ДАІ

# БУДЗЬЦЕ ЎВАЖЛІВЫМІ НА ДАРОГАХ

Хуткімі тэмпамі развіваецца транспарт у нашай краіне. У сувязі з гэтым рэзка абвастраецца праблема бяспекі руху, адным з рашаючых фактараў якой з'яўляюцца паводзіны вадзіцеляў, пешаходаў і пасажыраў. Ніводная арганізацыя, прадпрыемства не можа зараз працаваць без транспартных паслуг, практычна ні адзін грамадзянін не абыходзіцца без іх. Перад мінскімі транспартнікамі пастаўлена галоўная задача — забяспечыць ва ўмовах узрастання інтэнсіўнасці і хуткасці руху бесперабойнае абслугоўванне насельніцтва, зручную і бяспечную эксплуатацыю транспарту.

Гэта значыць дабіцца хуткасці, зручнасці і пастаяннай бяспекі перавозак грузаў і пасажыраў. Выкананне гэтых задач абумоўлена шэрагам спецыфічных складаных абставін, адной з якіх з'яўляецца неабходнасць весці бесперапынную барацьбу супраць аварыйнасці на дарогах.

Сапраўды, у дарожным руху ўдзельнічаюць адначасова сотні тысяч людзей, карыстаючыхся дарогай ці ў якасці пешаходаў, ці ў якасці вадзіцеляў.

Нягледзячы на пэўную і разнастайную работу, праведзеную ў Мінску па бяспецы дарожнага руху, стан аварыйнасці выклікае сур'ёзную заклапочанасць, хвалюе ўсю нашу грамадскасць, органы ўлады і кіравання, пабуджае да пошуку і ўкаранення ў практыку мер, выкліканых эфектыўна ўплываць на зніжэнне ўзроўню аварыйнасці.

У I квартале 1977 года ў Мінску адбылося 131 дарожна-транспартнае здарэнне, загінула пры гэтым 14 чалавек і атрымалі раненні 126 чалавек. Па віне пешаходаў адбыліся 73 дарожна-транспартныя здарэнні, прычым удзельнікамі 26 дарожных аварый былі п'яныя пешаходы.

Абсалютная большасць аварый на дарогах бывае па прычыне няправільных дзеянняў удзельнікаў руху — вадзіцеляў, пешаходаў і пасажыраў.

Недысцыплінаванасць пешаходаў — асноўная прычына няшчасных выпадкаў з людзьмі, якія пацярпелі ад наезду транспарту. Яшчэ, на жаль, сустракаюцца такія пешаходы, якія ведаюць правілы дарожнага руху, але з-за недысцыплінаванасці бессэнсоўна рызыкуюць сваім жыццём і здароўем.

Сваімі паводзінамі яны ствараюць аварыйную абстаноўку, чым падвяргаюць нябяспецы не толькі сябе, але тых, хто знаходзіцца побач.

Таварышы ўдзельнікі руху — вадзіцелі, пешаходы, пасажыры! Пастаянна вывучайце і выконвайце правілы бяспекі руху! Будзьце ўважлівымі і ўзаемна ветлівымі на дарогах!

Н. РАБЫ,
супрацоўнік ДАІ УСС
Мінгарвыканкома.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.